# ЧЫМ КАЗАНЬ БРАЦЬ БУДЗЕМ?

## Прафесійным майстэрствам і крэатыўным падыходам

**«Гэтая мадэль рукзакоў прызначана для маладых дзяўчат, таму дызайн вітрыны прадстаўлены ў выглядзе вокладкі часопіса моды з трэндамі вясны. Канцэпцыя паўтарае здымкі на Polaroid як адсылку да Instagram, якім карыстаюцца прадстаўніцы мэтавай аўдыторыі. Кубы на фоне сімвалізуюць шматпавярховікі горада. Асноўным колерам абраны трэндавы пяшчотна-ружовы... Кампазіцыя нагадвае пра вясеннія дні, пікнікі і пасядзелкі».**

**«Вывучыўшы ўсе тэндэнцыі моды, я магу казаць, што на сённяшні дзень рукзакі ўсё больш набіраюць папулярнасць сярод модніц. Раней гэта быў аксесуар спартыўнага стылю без асаблівых індывідуальных рыс. А цяпер ён мае розныя формы, памеры і дызайн. Падыходзіць пад сукенку, шорты, штаны і мноства іншых вобразаў. Паколькі рукі ў сучасных людзей занятыя тэлефонамі і планшэтамі, большасць аддаюць перавагу рукзакам...»**

**Як вы думаеце, прадстаўнікі якой прафесіі займаюцца сёння афармленнем вітрын? А ці ведаеце вы, якімі навыкамі павінны валодаць, напрыклад, спецыялісты рэстараннага сэрвісу? Ці чаму фларыстыка — не жаночая справа? Рэспубліканскі конкурс WorldSkills Belarus 2018 даў адказы на многія пытанні і стаў сапраўдным гідам у свет сучасных прафесій. За два дні Футбольны манеж і Falcon Club, дзе размясціліся конкурсныя пляцоўкі па 37 кампетэнцыях, наведала некалькі тысяч школьнікаў.**



У кампетэнцыі «Кандытарскае мастацтва» ўдзельнікі спаборніцтваў стваралі сапраўдныя салодкія шэдэўры.

### ЗАГЛЯДЗЕЦЦА НА ВІТРЫНУ

— Мерчандайзінг вітрын — вельмі цікавая сфера, якая знаходзіцца на стыку мастацтва, дызайну, псіхалогіі, псіхафізікі, эканомікі, маркетынгу і рэкламы, — тлумачыць **галоўны эксперт у кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг», дырэктар ТАА «Цэнтр паспяховых продажаў» Алена ІВАНОВА.** — Задача візуальнага мерчандайзера — прыпаднесці пакупніку тавар у выгадным святле. Вітрына ў гандлёвым аб'екце — перш за ўсё інструмент маркетынгу: пры дапамозе дызайнерскіх рашэнняў забяспечвае доўгатэрміновую камунікацыю са спажыўцом.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

# ЧЫМ КАЗАНЬ БРАЦЬ БУДЗЕМ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Яна можа быць сапраўдным аб'ектам сучаснага мастацтва, але існуе вельмі шмат іншых інструментаў, якія ўздзейнічаюць на аўдыторыю, таму проста мастацтвам гэты занятак назваць усё ж такі нельга: гэта яшчэ і навука — як заахвоціць да пакупкі? Прафесіянал можа не толькі павысіць продажы, але і палепшыць імідж крамы.

На нацыянальным чэмпіянаце WorldSkills Belarus 2018 кампетэнцыя «Візуальны мерчандайзінг» упершыню трапіла ў конкурсную праграму. Задачай канкурсантаў было за два дні (агулам за 16 гадзін) распрацаваць канцэпцыю і аформіць вітрыну. У якасці галоўнага тавару ўсім канкурсантам былі прапанаваныя восем мадэляў рукзакоў ад «Галантэі», пэўны рэквізіт, плюс кожнаму дасталася «чорная скрыня».

У першы дзень спаборніцтваў маладым прафесіяналам неабходна было прадэманстраваць навыкі правядзення даследавання спажывецкіх характарыстык прадукту, пазіцыянавання яго на рынку, пакупніцкіх пераваг мэтавай аўдыторыі, прасцей кажучы, улавіць яе настрой, а таксама навыкі дызайну для стварэння кампазіцыі вітрыны. Агульная для ўсіх тэма — «Вясна ў горадзе»...

Затым ствараўся эскіз, складалася абгрунтаванне дызайну, падбіраўся рэквізіт і афармлялася вітрына. Абавязковымі былі крэатыўны падыход і аўтарская трактоўка ў выкарыстанні прадметаў з «чорнай скрыні», якія сталі для ўсіх канкурсантаў сюрпрызам. Таксама эксперты ацэньвалі эфектыўнасць створанай камунікацыі з патэнцыяльным спажыўцом.

**Важныя якасці для візуальнага мерчандайзера — добры густ, пачуццё стылю, кампазіцыі і колеравага балансу, творчае, крэатыўнае мысленне, веданне модных тэндэнцый, актыўнасць, ініцыятыўнасць, арганізаванасць, уменне працаваць у камандзе, жаданне пастаянна вучыцца новаму.**

— Гэта прафесія апрыёры не можа быць масавай, — упэўнена Алена Іванова, — але такія спецыялісты сёння ў дэфіцыце. Працу візуальнага мерчандайзера можна назваць універсальнай: ён запатрабаваны ў самых розных сферах — ад магазінаў будматэрыялаў да элітных бутыкоў моднай вопраткі, аксесуараў і абутку. Не сакрэт, што турысты вельмі любяць фатаграфавацца на адпачынку на фоне шыкоўных вітрын. І нашай сталіцы вельмі не хапае такіх, якія былі б тварам горада, дадавалі яму «цікавінку». Таму Гільдыя маркетолагаў, Цэнтр інавацыйнага развіцця і Цэнтр паспяховых продажаў абвясцілі сёлета рэспубліканскі конкурс на найлепшую вітрыну ў краіне.

Цікава, што сярод канкурсантаў у кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг» на рэспубліканскім чэмпіянаце WorldSkills Belarus 2018 былі як прадстаўнікі ВНУ, так і каледжаў. Перамагла ў ім навучэнка Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. Кедышкі Паліна Гурыновіч.



Над стварэннем вясельнага букета шчыруе навучэнец сталічнай гімназіі № 10 Павел Свірскі.

## КАЛІ КВЕТКІ — НЕ ПРОСТА ХОБІ

А ў кампетэнцыі «Фларыстыка» сярод канкурсантаў былі нават школьнікі: Павел Свірскі са сталічнай гімназіі № 10, Ганна Азарка з пінскай школы № 2 і Анастасія Стэмплеўская з Правамастоўскай сярэдняй школы. Дарэчы, гэта кампетэнцыя таксама аказалася ў конкурснай праграме дэбютантам.

— Фларыстыку памылкова лічаць жаночай прафесіяй. У сур'ёзных конкурсах і шоу перамагаюць мужчыны. У суседняй Расіі чэмпіёны апошніх гадоў у фларыстыцы таксама мужчыны, — уводзіць у курс справы **эксперт у кампетэнцыі, педагог Мінскай школы фларыстыкі (Minsk Flower School) Раман ФЕДАРОВІЧ.** — Магчыма, у іх большая нацэленасць на вынік і барацьбу, яны больш амбіцыйныя? Шмат дзяўчат, што прыходзяць у нашу сферу, уяўляюць сабе, што яны будуць пырхаць як матылькі вакол кветак, але хутка сыходзяць, бо раптам высвятляецца, што гэта цяжкая фізічная праца: надарваныя ад цяжару спіны, знаходжанне ў парніках ці, наадварот, у пастаянным холадзе, бо кветкі захоўваюцца ў халадзільніку пры тэмпературы плюс пяць градусаў, праблемы з запясцямі і скурай, алергія... Ці кожная вытрымае?

Аднаго толькі валодання тэхнікай складання букета фларысту мала. Абавязкова трэба мець густ, валодаць ведамі па эстэтыцы, біялогіі, экалогіі, займацца гербарыем. У кожную сваю работу неабходна ўкладваць не толькі прафесійныя навыкі, але і свае сэрца і душу.

На нацыянальным чэмпіянаце ўдзельнікі павінны былі стварыць кампазіцыю са зрэзанымі кветкамі, скласці букет на ўласных сцяблінах, вясельны букет і настольную кампазіцыю з гаршковымі раслінамі. На вясельны букет адводзілася тры гадзіны. На астатнія заданні — па дзве. Згодна з умовамі спаборніцтваў, усім канкурсантам былі прапанаваныя аднолькавыя расліны (эквадорскія ружы, герберы, хрызантэмы, эўкаліпт, аспарагус і іншыя), інструменты, расходныя матэрыялы, спецыяльныя каркасы і прыстасаванні. Толькі вынікі атрымаліся ва ўсіх розныя. На конкурсе можна было пабачыць сапраўдныя аўтарскія работы.

**«Шмат дзяўчат, якія прыходзяць у нашу сферу, уяўляюць сабе, што яны будуць пырхаць як матылькі вакол кветак».**

Для Беларусі такая сфера, як прафесійная фларыстыка, яшчэ даволі маладая. Па словах Рамана Федаровіча, трапляюць у яе рознымі шляхамі. Часта на курсы ці ў школу фларыстыкі прыходзяць жанчыны, якія знаходзяцца ў дэкрэце, або навучанне асновам прафесіі адбываецца ва ўстановах дадатковай адукацыі паралельна з атрыманнем асноўнай.

— А вось моладзі ў нашай прафесіі не так і шмат, між іншым па ўмовах конкурсу WorldSkills да ўдзелу ў ім дапускаюцца маладыя людзі ва ўзросце да 22 гадоў. Нашых канкурсантаў мы збіралі літаральна па «крупінках»па ўсёй краіне, але тыя, хто сюды трапіў, гэта сапраўдныя алмазы, — усміхаецца эксперт. — Нацыянальны чэмпіянат для нас — гэта яшчэ і магчымасць папулярызаваць фларыстыку сярод моладзі. Мяркую, што на міжнародным узроўні мы можам канкурыраваць і з расіянамі, і з прадстаўнікамі Казахстана, а дамінуюць у гэтай сферы зараз прадстаўнікі Паўднёвай Карэі і Кітая. Для іх фларыстыка — гэта філасофія і лад жыцця, і рыхтаваць у гэтай галіне там пачынаюць яшчэ з дзяцінства.

## ЁН І САМЕЛЬЕ, І БАРМЕН

**Яна БУГЛАК, магістрант Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання,** прадстаўляла летась Беларусь на міжнародным конкурсе WorldSkills International у Абу-Дабі ў кампетэнцыі «Рэстаранны сэрвіс». А на нацыянальным чэмпіянаце выступала ў той жа кампетэнцыі ўжо ў ролі галоўнага эксперта. Для недасведчанага чалавека спецыяліст рэстараннага сэрвісу — гэта проста афіцыянт. Але дзяўчына такое меркаванне катэгарычна абвяргае.

— Рэстаранны сэрвіс патрабуе самых шырокіх ведаў у галіне міжнароднай кухні, напіткаў і барнага абслугоўвання, — тлумачыць Яна. — Размова ідзе пра самую важную асобу ў абслугоўванні кліентаў, фактычна адзіную, з кім госць сутыкаецца. На конкурсе ўдзельнікі абавязкова дэманструюць свае ўменні ў модулях Casual Dining (кафэ) і Fine Dining (рэстаран). Апошні мае на ўвазе поўнае абслугоўванне, калі абсалютна ўсё за госця робіць афіцыянт: раскладвае сурвэткі, разлівае напіткі, адсоўвае крэслы... Яму неабходна валодаць не толькі практычнымі навыкамі, але і мець добрыя манеры, быць псіхолагам, упэўненым і знаходлівым чалавекам. Спецыяліст рэстараннага сэрвісу — універсальны работнік, які павінен умець зрабіць закуску, салату, нарэзку з садавіны ў прысутнасці кліента, прыгатаваць дэсерт з агнём, парцыянаваць гарачыя стравы. Ён ідэнтыфікуе моцныя спіртныя напіткі і віны, фактычна выконвае функцыі самелье, а таксама працуе і за бармена — умее гатаваць безалкагольныя і алкагольныя кактэйлі (усе рэцэптуры павінны быць у яго галаве). Адным з заданняў на конкурсе было прыгатаванне крэатыўнага кактэйлю з інгрэдыентаў, што знаходзіліся ў «чорнай скрыні». Яшчэ адзін абавязковы навык — уменне варыць каву: амерыкана, экспрэса, латэ і капучына.

Будзем спадзявацца, што нацыянальны чэмпіянат запаліў новыя «зоркі» на прафесійным Алімпе, якія належа годна прадставіць Беларусь на сусветным першынстве WorldSkills International у Казані.